# ВОДГУК
## на аўтарэферат дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўны «Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)»,

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Аўтарэферат дысертацыі Н.К. Сямашка прысвечаны даследаванню адлюстравання ў навуковых работах тэматыцы аграрнай гісторыі ў перыяд з канца XVIII ст. па 1850-я гг. Гэта тэма надзвычай актуальна ў сувязі з тым, што беларускія землі на той момант у эканамічным плане былі аграрнымі, а больш за 90 % насельніцтва якой складалі сяляне. Адначасова з захаваннем прыгону зараджаліся новыя буржуазныя адносіны, якія паступова пранікалі і ў беларускую вёску. Працэсы, якія адбываліся ў акрэслены перыяд сацыяльна-эканамічнага развіцця, падрыхтавалі надзейны падмурак для далейшых вырашальных гістарычных падзей ў айчыннай вёсцы: у тым ліку адмену прыгоннага права і паступовы пераход да новага эканамічнага ўкладу. Таму абагульненне гістарычных даследаванняў па дадзенай праблематыцы, безумоўна, з'яўляецца надзвычай актуальным на сённяшні дзень. Даследаванне Н.К. Сямашка рэалізавана з выкарыстаннем сучасных навуковых метадаў з прыцягненнем вялікага масіву даследаванняў па аграрнай гісторыі і прадстаўляе значную навуковую каштоўнасць.

У «Агульнай характарыстыцы працы» саіскальнікам ставяцца мэта і задачы даследавання. Вызначаюцца прадмет і аб'ект даследавання, а таксама падкрэсліваецца навуковая навізна.

У першай главе саіскальнік акрэсліў ступень даследавання праблематыкі і прааналізаваў працы папярэднікаў па гістарыяграфіі аграрнай гісторыі. Пры гэтым падкрэсліваецца, што праблема аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. дасканала не вырашана і ёй не надаецца дастатковай увагі ў гістарычнай навуцы. Зроблена выснова, што вызначаны перыяд выпадае амаль з усіх абагульняючых прац па гістарыяграфіі ў якасці самастойнага перыяду аграрнай гісторыі Беларусі.

У другой главе падрабязна разгледжана гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – 1850-х гг. перыяду Расійскай імперыі (сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.), вызначаны характэрныя рысы гэтага этапу, у тым ліку падкрэслены апісальны характар публікацый, без сур'ёзнага паглыблення ў сацыяльна-эканамічныя працэсы.

У трэцяй главе разглядаюцца гістарычныя даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі акрэсленых храналагічных межаў дысертацыі савецкага перыяду. Саіскальнік падкрэслівае, што ў гэты час гісторыкі звярнулі сваю ўвагу на пытанні аграрнай гісторыі Беларусі і правялі грунтоўныя даследаванні. Падрабязна разглядаецца эвалюцыя метадалагічных падыходаў даследаванняў гэтага перыяду ў розныя гады існавання савецкай дзяржаўнасці, асноўная тэматыка навуковых прац і іх характэрныя рысы.

У чацвёртай главе даследуецца гістарыяграфія Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., саіскальнікам праведзены аналіз сучасных даследаванняў па аграрнай праблематыцы Беларусі першай паловы XIX ст., адлюстравана дынаміка наяўных змен у метадалагічных падыходах, што асабліва вылучае дадзены перыяд, робіцца выснова пра пераасэнсаванне праблем крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і генезісу капіталізму ў Беларусі, зыходзячы з новых метадалагічных падыходаў.

Заключэнне саіскальнік сфармуляваў у выглядзе чатырох пунктаў. У кожным з іх прысутнічаюць спасылкі на ўласныя публікацыі. Прыведзеныя высновы адпавядаюць мэце і задачам, пастаўленым у пачатку даследавання, і не выклікаюць заўваг.

Неабходна адзначыць публікацыйную актыўнасць саіскальніка: 6 артыкулаў у навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваення вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, 10 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

Змест аўтарэферата дысертацыі «Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)», дазваляе зрабіць выснову пра тое, што прадстаўленая да абароны дысертацыя Н.К.Сямашка з'яўляецца самастойным і арыгінальным даследаваннем, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Галоўны спецыяліст упраўлення культуры
Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Д.В.Юрчак

9.12.2024

Подпись Юрчака Д.В.
заверяю
Ведущий референт
Базанкова А.Ю.